# ГІСТАРЫЧНАЯ ТЭМА Ў БЕЛАРУСКАЙ ОПЕРЫ І БАЛЕЦЕ

***А. В. Лісава,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт,*
*загадчык навукова-даследчага аддзела*
*ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»*

Так склалася, што сведчаннем сталасці нацыянальнай музычнай культуры з'яўляецца нараджэнне буйнога опернага твору на гістарычную тэму са слаўнага мінулага краіны. Наяўнасць такой оперы і опернага тэатра для ўзнаўлення ўрачыстых формаў грамадскага жыцця з даўніх часоў застаецца абавязковым сімвалам дзяржаўнай велічы.

Гісторыя рускай оперы вядзе свой пачатак, па розных меркаваннях, ад камічных і вадэвільных твораў 1779 г. («Млынар – калдун, падманшчык і сват» М. Сакалоўскага, «Санкт-Пецярбургскі гасціны двор» і «Няшчасце ад карэты» В. Пашкевіча, вадэвілі Фаміна)[1]. Буйны самастойны жанравы пласт склалі гістарычныя оперы А. Вярстоўскага і К. Кавоса. Але толькі з'яўленне «Івана Сусаніна» М. Глінкі (1836) робіць гістарычную оперу паказчыкам высокай ступені развіцця культуры, а гістарычны сюжэт – сімвалам моцнай, здабытай у слаўных перамогах дзяржаўнасці. Неператузыдзеныя шэдэўры ў дадзеным жанры – народныя трагедыі М. Мусаргскага.

У Заходняй Еўропе засваенне гістарычнай тэмы ў оперы адбываецца ўжо ў эпоху Барока (Монтэвердзі, Гендэль, Абэр, Тэлеман), тады ж паспявае набыць супярэчлівы вопыт і быць асэнсаваным як «прафанацыя гісторыі» [4, с. 5]. Асваенне гістарычнай тэматыкі працягваецца ў класічную эпоху і асабліва інтэнсіўна – у рамантычную, па меры станаўлення гістарычнай свядомасці ў грамадстве, з'яўлення і развіцця маладых мастацкіх нацыянальных школ.

Опера на беларускіх землях таксама вядзе гісторыю ад камічных твораў канца XVIII ст. («Агатка, альбо Прыезд пана» Я. Д. Голанда), а ў яе скарбонцы пачатку XIX ст. ёсць такі шэдэўр, як «Фаўст» А. Г. Радзівіла, створаны ў судружнасці з Ё. В. фон Гётэ (прэм'ера выбраных сцэн адбылася ў 1819 г., прэм'ера цалкам – у 1835 г.). Але пасля заняпаду прыгонна-ўласніцкага тэатру рух да скарэння новых оперных вяршынь амаль спыніўся.

У ліку першых твораў на гістарычны сюжэт, якія належаць беларускім (альбо звязаным з Беларуссю) аўтарам, – «Маргер» Канстанціна

[1] Паводле аналізу В. Дзёмінай, дату 1755 г. усталёўвае Якаб Штэлін у сваіх «Запісках» і М. Фіндейзен у кнізе «Очерки по истории музыки в России с древнейших времен до конца XVIII века», спасылаючыся на прэм'еру «Цэфала і Прокрыса» Ф. Арайі [3].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Горскага. Опера напісана каля 1905 г., пастаўлена толькі ў 1927 г. у польскай Познані. Сюжэт адсылае да гісторыі ВКЛ, яе галоўны герой – літоўскі князь Маргер. Падзеі оперы адбываюцца ў XIV ст. у літоўскім замку Пулен і нямецкім Марыенбургу (зараз польскі Мальборк). Лібрэта напісана па-польску (па матывах паэмы У. Сыракомлі, як мяркуецца, самім кампазітарам пад псеўданімам Вальгер), героямі оперы выступаюць ліцвіны язычніцкай веры і крыжаносцы. Пазнавальныя жанравыя паказчыкі оперы як гістарычнай героіка-патрыятычнай (у сінтэзе з элементамі лірыка-псіхалагічнай драмы і фантастычнай оперы) – «антаганістычны канфлікт дзвюх нацыянальных сфер, розных светапоглядаў» [1, с. 74], сацыяльна-палітычная канфрантацыя, тыповыя оперныя сітуацыі і героі. Для паказа старажытнасці абіраецца абагульнена старадаўні «былінны склад».

Наступныя творы на гістарычную тэму з'явіліся праз часавы прамежак – толькі ў канцы 1930-х гг. У якасці гістарычных трэба разглядаць першыя ўзоры савецкай героіка-патрыятычнай оперы: «Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага (1938)[2] і «У пушчах Палесся» А. Багатырова (прэм'ера 28.08.1939). У «Міхасі Падгорным» узноўлены падзеі пачатку Першай сусветнай вайны, Часовага ўраду Керанскага і ўласна Кастрычніцкай рэвалюцыі, да якой далучаюцца сяляне на чале з Міхасём. У оперы А. Багатырова паводле «Дрыгвы» Якуба Коласа не толькі ўзнаўляюцца падзеі польскай акупацыі Заходняй Беларусі ў 1920 г., але і занатоўваецца рэальная асоба – дзед Талаш.

Прызывы да стварэння сучаснай беларускай оперы і балета, крытычная ацэнка твораў Шастаковіча «Лэдзі Макбет Мцэнскага павета» і «Светлы ручай», ухваленне так званай ідэалагічна правільнай, «сэрвільнай» літаратуры [2, с. 250] прывялі да таго, што гістарычная тэма ў мастацтве «сціснулася» да тэмы сучаснасці. Гісторыя Беларусі ў айчыннай літаратуры пачыналася толькі з 1917 г. Рэдкім выключэннем стаў сюжэт пра Кастуся Каліноўскага, палітычная дзейнасць якога была пададзена праз «крывое люстэрка» барацьбы з расійскім царызмам. Першы беларускі фільм[3] і адна з першых опер на гістрычную тэму «Кастусь Каліноўскі» (1949) Д. Лукаса адсылаюць да падзей 1863–1864 гг.[4]

Падзеі Вялікай Айчыннай вайны адсунулі на другі план усе іншыя творчыя задумы. Іх першым адлюстраваннем стала опера Я. Цікоцкага

[2] Прэм'ерай оперы «Міхась Падгорны» 10.03.1939 г. быў адкрыты сучасны будынак НАВТ оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

[3] Першым беларускім гістарычным фільмам стала лента «Кастусь Каліноўскі» рэжысёра У. Гардзіна з М. Сіманавым у галоўнай ролі (1928).

[4] Цікава, што іншы герой паўстання 1864 г. таксама атрымаў сваё жыццё ў тэатры, праўда, з нагоды паўстання Парыжскай Камуны 1871 г.: гэта нацыянальны герой Польшчы і Францыі Яраслаў Дамброўскі, галоўны герой оперы В. Рудзіньскага «Камендант Парыжа» (1957).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Алеся» (прэм’ера 24.12.1944 г. у вызваленым Мінску) – твор, які пісаўся літаральна па гарачых слядах рэальных падзей, хай і праз абагульненых персанажаў. Сюжэт распавядае пра дзейнасць партызанскага атрада, які здзяйсняў падрывы на чыгунцы, і яго кіраўнічку Алесю. Гераічны пафас абапіраецца на выдатна распрацаваную лірычную аснову класічнага і фальклорнага паходжання, а таксама савецкую масавую песеннасць. Опера М. Аладава «Андрэй Касценя» (1948 г., радыямантаж 1959 г., пастаноўка 21.04.1970 г.) – таксама, як і «Дрыгва», мае рэальны гістарычны прататып галоўнага героя – гэта вядомы ўдзельнік падпольнага руху ў Оршы Канстанцін Заслонаў.

Са звяртання да прозы В. Быкава пачалася новая ступень асэнсавання ваеннай тэмы. Выдатныя для свайго часу творы – балет Я. Глебава «Альпійская балада» (1967)[5] і опера «Сцежкаю жыцця» Г. Вагнера (1980) на сюжэт аповесці В. Быкава «Воўчая зграя» распавядаюць аб вайне з пазіцыі каштоўнасці жыцця кожнага асобнага чалавека. Тэма вайны адгукнулася і ў першай беларускай оперы для дзяцей – «Марынцы» Р. Пукста (31.12.1955).

Аб рэальных гістарычных асобах праз уласны погляд аўтараў распавядаюць оперы «Надзея Дурава» А. Багатырова (1947 г., пастаноўка 22.12.1956 г.) і «Джардана Бруна» С. Картэса (1977). Да рамантычна-гістарычнага напрамку належала і другая нацыянальная прэм’ера 1970-х – «Сівая легенда» Д. Смольскага (з поспехам узноўлена ў 2012 г.).

На сучасным этапе (1990–2010) у беларускім тэатры ствараюцца творы на гістарычную тэматыку сапраўды буйнога маштабу. Перш за ўсё адзначым выдатны балет А. Мдзівані «Страсці (Рагнеда)» (1995)[6]. У ім узнята адна з ключавых тэм з гісторыі Беларусі: Хрышчэнне Русі. Адначасова вакол гэтай падзеі ўдала развернуты некалькі тэатральна-драматургічных вузлоў: лірыка-псіхалагічны (юнацтва і каханне Рагнеды), асабіста-трагічны (забойства бацькоў, згвалтаванне), сацыяльна-трагічны (знішчэнне Полацка), палітычны (змена ўлады), маральны (асветніцкая дзейнасць Рагнеды). Нягледзячы на ўсе атрыбуты тэатральнага рамантызму, у балеце *найменш міфа* і *найбольш гісторыі*.

У 2010-х гістарычную лінію працягнулі балеты В. Кузняцова «Вітаўт» (2013)[7] і «Анастасія» (2018)[8]. Калі для гісторыка падзеі вакол фігуры Анастасіі Слуцкай аб’ектыўна ацэньваюцца як малазначныя для

[5] Акрамя балета Я. Глебава, быкаўскі сюжэт увасоблены ў оперы украінскага кампазітара В. Губарэнкі пад такой жа назвай, які ў Мінску быў пастаўлены ў 1986 г.

[6] Харэограф-пастаноўшчык В. Елізар’еў, дырыжор-пастаноўшчык Г. Праватораў, мастак-пастаноўшчык В. Окунеў.

[7] Аўтары лібрэта А. Дудараў, У. Рылатка, харэограф-пастаноўшчык Ю. Траян, дырыжор-пастаноўшчык В. Воліч, мастак-постаноўшчык Э. Гейдэбрэхт.

[8] Аўтар лібрэта А. Дзялендзік, харэограф-пастаноўшчык Ю. Траян, дырыжор-пастаноўшчык А. Галанаў, мастак-постаноўшчык А. Касцючэнка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыі, то для беларускага мастацтва – гэта найудалы міф аб жанчыне-воіну, якая змагалася і перамагла. Узаемадзеянне князёў Слуцкіх і Мсціслаўскіх з ханам Ахматам і яго дачкой Заірай уліваецца ў агульную перарывістую гісторыю адносін паміж рускімі і татарскімі станамі, вядомую па «Князі Ігары» А. Барадзіна.

З першых старонак «Вітаўта» мы апынаемся ў рамантызаванай паэтыцы старажытнай зямлі ВКЛ. У лясных кутках, дзе яшчэ працягваюць існаваць язычніцкія абрады і звычаі, завязваецца любоўны трохкутнік з двух мужчынскіх персанажаў (Вітаўт і Ягайла) і аднаго жаночага (Ганна). Персанажы балета – рэальныя гістарычныя асобы Кейстут і Бірута, Ягайла і Вітаўт, Ганна і Ядзвіга.

У кантэксце размовы трэба падкрэсліць і ўхваліць прыналежнасць гэтых балетаў да лініі беларускага *міфу аб гісторыі*. У гэтым іх нацыянальная адметнасць і мастацкая жыццяздольнасць. Можна дапусціць, што толькі ў такім рамантызаваным, тэатралізаваным, міфалагізаваным выглядзе гісторыя Беларусі можа працягнуць сваё існаванне на сцэне і прыцягнуць увагу сучасніка.

Да гэтага ж напрамку дададзім оперу А. Залётнева «Міхал Клеафас Агінскі. Невядомы партрэт» (2013, пастаноўка Маладзечанскага маладзёжнага народнага музычнага тэатра). Сюжэт разгортваецца выключна ў лірычнай плоскасці і адлюстроўвае падвойнае расчараванне князя. У мюзікле У. Кандрусевіча «Соф'я Гальшанская» дзейнічае рэальны гістарычны персанаж – маці дынастыі каралей Рэчы Паспалітай, жонка караля Уладзіслава Ягайлы[9]. Галоўны акцэнт у фабуле зроблены на мудрагелістай інтрызе пакінутай жанчыны супроць больш шчаслівай у каханні суперніцы (як у «Сівой легендзе»).

Такім чынам, паводле нацыянальнай гісторыі беларускае мастацтва буйных музычна-тэатральных формаў стварае не *гісторыю ў музыцы*, а, хутчэй, *міф аб гісторыі*. Сродкамі мастацкага абагульнення яно адштурхоўваецца ад гістарычнай фабулы (а месцамі і ад вобразаў рэальных гістарычных асоб) і перамяшчаецца ў безчасавую прастору міфу, у якім разгортваюцца вечныя і невырашальныя канфлікты дабра і зла.

Міфалагізацыя беларускай гісторыі – адна з асаблівасцей яе існавання ў прасторы айчыннага мастацтва. Гэта гаючая крыніца яго жыцця. Сімвалам такой міфалагізацыі сталася опера «Песня аб шчасці». Што гэта за опера? Яна існавала ў творчым плане амаль кожнага кампазітара з канца 1930-х (калі творчасць членаў БСК была пастаўлена на планавую аснову) і прыблізна да сярэдзіны 1950-х. Некалькі кампазітараў заяў-

[9] Лепшы спектакль музычнага тэатра 2013 г. па выніках III Рэспубліканскага конкурса «Нацыянальная тэатральная прэмія». Пастаноўшчыкі: дырыжор Ю. Галяс, рэжысёр М. Кавальчык, мастак А. Меранкоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лялі «Песню аб шчасці» ў творчых планах і прыводзілі пісьмовыя справаздачы, што работа над ёю планава вядзецца. І... не напісалі. Ва ўсякім разе ў тэатрах Беларусі не было пастаўлена ніводнага спектакля з такой назвай.

Канешне, хацелася б, каб гісторыя Беларусі адлюстравалася таксама ў творах кшталту опер Мусаргскага з іх кропкавым і трапным ахватам неабсяжнай сацыяльнай шырыні, адноснай дакладнасцю гісторыка-палітычнай інфармацыі і вышынёй духоўна-этычных абагульненняў. Але для гэтага многія факты з далёкага і недалёкага мінулага працягваюць «балець» і не перажыты анталагічна.

За гады свайго існавання гістарычная тэма ў оперным і балетным тэатры Беларусі ахапіла вялікую часавую прастору. Аднак захавала ў ліку сваіх архетыпічных знакаў разуменне гісторыі як «складанага з'яднання індывідуальнага лёсу з лёсамі саслоўяў, нацый, дзяржаў і ў выніку – усяго чалавецтва» [4, с. 8]. Тыпалагічнай прыкметай жанру стаў метад раскрыцця сюжэту з гісторыі народа праз любоўную тэму як найбольш агульную і тэатральную. Рамантызаваная гісторыя застаецца самай прывабнай для гледача формай азнаямлення з мінулым сваёй радзімы.

1. *Аладова, Р.* Константин Горский его опера «Маргер» в контексте белорусской культуры / Р. Аладова. – Минск : УО «Белорусская государственная академия музыки», 2005. – 216 с.

2. *Васючэнка, П.* Літаратура ва ўмовах таталітарызму / П. Васючэнка // Доля беларускае культуры под Саветамі. 1920–1991 гг. / Укл. А. Е. Тарас. – Мінск : Харвест, 2012. – С. 224–283.

3. *Дёмина, В.* Отечественное музыкознание о проблемах становления русской оперы / В. Демина // Оперный театр: вчера, сегодня, завтра : сб. ст. / ред.-сост. А. М. Цукер. – Ростов-на-Дону : Изд. РГК им. С. В. Рахманинова, 2010. – С. 251–258.

4. *Черкашина, М.* Историческая опера эпохи романтизма / М. Черкашина. – Киев : Музична Україна, 1986. – 151 с.

5. *Штейнпресс, Б.* Оперные премьеры XX века. – 101-1940 : словарь. – М. : Сов. композитор, 1983. – 470 с. ; 1941–1960 : Словарь. – М. : Сов. композитор. 1986. – 344 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ